УДК 327.2(37)

**В. А. Астрога**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ГЕАПАЛІТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ МЫСЛІЦЕЛЯЎ СТАРАЖЫТНАГА РЫМА

У артыкуле разглядаецца развіццё геапалітычных поглядаў у Старажытным Рыме. Прааналізаваны і ахарактарызаваны творы такіх найбольш яркіх і вядомых у гэтай галіне старажытнарымскіх філосафаў, географаў і гісторыкаў, як Марк Тулій Цыцэрон, Страбон, Луцый Анэй Сенека, Луцый Местрый Плутарх, Публій Карнэлій Тацыт і Аміян Марцэлін. Выяўлена сувязь геапалітычных поглядаў і канцэпцый рымскіх мысліцеляў з геапалітычнымі тэорыямі Старажытнай Грэцыі. Пазначаны экспансіянісцкі характар геапалітычных поглядаў у часы Старажытнага Рыма. Адзначана нявывучанасць праблемы развіцця Рымскай геапалітычнай думкі ў айчыннай гістарыяграфіі. Зроблена выснова, што геапалітычныя погляды старажытнарымскіх мысліцеляў канцэптуальна развіваюць геапалітычныя гледжанні старажытнагрэчаскіх філосафаў і, будучы заснаванымі на геаграфічным дэтэрмінізме, ляглі ў аснову тэорый класікаў геапалітычнай думкі XIX–XX стст. і сучаснасці.

**Ключавыя словы:** гісторыя, геаграфія, геаграфічны дэтэрмінізм, прырода, экспансія, вайна, геапалітыка, погляды, канцэпцыя.

**Для цытавання:** Астрога В. А. Геапалітычныя погляды мысліцеляў Старажытнага Рыма // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 1 (257). С. 88–91.

**V. A. Astroha**
Belarusian State University

# GEOPOLITICAL VIEWS OF THINKERS OF ANCIENT ROME

The article examines the development of geopolitical views in Ancient Rome. The works of the most prominent and well-known ancient Roman philosophers, geographers and historians in this field are analyzed and characterized as Marcus Tullius Cicero, Strabo, Lucius Anelius Seneca, Lucius Mestrius Plutarch, Publius Cornelius Tacitus and Ammianus Marcelin. The connection of the geopolitical views and concepts of Roman thinkers with the geopolitical theories of Ancient Greece is revealed. The expansionist nature of geopolitical views in the times of Ancient Rome is indicated. The unexplored nature of the problem of the development of Roman geopolitical thought in Russian historiography is noted. It is concluded that the geopolitical views of ancient Roman thinkers, conceptually developing the geopolitical views of ancient Greek philosophers and based on geographical determinism, formed the basis of the theories of the classics of geopolitical thought of the XIX–XX centuries and modernity.

**Keywords:** history, geography, geographical determinism, nature, expansion, war, geopolitics, views, concepts.

**For citation:** Astroha V. A. Geopolitical views of thinkers of Ancient Rome. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 1 (257), pp. 88–91 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Старажытнарымская геапалітычная думка, нягледзячы на сваю своеасаблівасць, мае старажытнагрэчаскія карані. Вядома, што ў Рыме карысталіся павагаю творы элінскіх філосафаў, гісторыкаў і географаў. Дастаткова шмат рымскіх аўтараў, у працах якіх можна заўважыць геапалітычныя падыходы, былі грэчаскага паходжання.

Свае думкі наконт геапалітыкі рымскія гісторыкі, географы і пісьменнікі выказвалі даволі часта, бо іх дзяржава безупынна вяла захопніцкія войны, пашыраючы межы імперыі. Таму на старонках сваіх твораў разам з апісаннем ваенных падзей яны выказваліся наконт уплыву геаграфічных умоў на дзеянні рымскіх імператараў і палкаводцаў, патэнцыйныя пагрозы для імперыі, выбар мэтаў і кірункаў заваявальных паходаў. Сувязь паміж геаграфіяй і палітыкай у часы Рымскай імперыі была відавочнай. Безумоўна, у гэтай сувязі рымскую геапалітыку трэба называць экспансіяністкай. Нездарма менавіта рымляне прыдумалі выраз «terra nullius cedit primo occupanti» – «нічыйныя землі належаць тым, хто іх першымі захопіць». «Нічыйнымі» землі маглі лічыцца нават тады, калі там ужо нехта жыў, але, на погляд рымлян, гэта былі «дзікія варвары».

Пазначым, што актуальнасць і навізна праведзенага даследавання заключаецца ў недастатковай колькасці навуковых даследаванняў, непасрэдна прысвечаных аналізу геапалітычных поглядаў рымскіх мысліцеляў.

**Асноўная частка.** Разгледзім геапалітычныя погляды і думкі асобных, найбольш яскравых рымскіх філосафаў, гісторыкаў, географаў і пісьменнікаў.

**Марк Тулій Цыцэрон** (106–43 гг. да н. э) нарадзіўся ў багатай, але нязнатнай сям'і недалёка ад Рыма. Ён шырокавядомы як філосаф, пісьменнік, аратар, юрыст і дзяржаўны дзеяч. Цыцэрон не стварыў нейкай арыгінальнай уласнай геапалітычнай канцэпцыі, але выказваў у сваіх творах падобныя погляды. Асабліва гэта бачна ў ягоным творы, так званым дыялогу «Аб дзяржаве». Так, кажучы аб заснаванні Ромулам Рыма, ён адзначыў вялікую важкасць геаграфічнага фактару развіцця дзяржавы, асабліва выбару месцазнаходжання яе сталіцы: «Што датычыць месца для горада, якое кожны, які імкнецца стварыць даўгавечную дзяржаву, павінен вызначаць вельмі аглядна, то Ромул абраў яго незвычайна ўдала … бо не падсунуў горада да мора … добра разумеў, што прыморскае становішча зусім не выгадна для тых гарадоў, якія закладаюцца ў надзеі на іх даўгавечнасць і магутнасць, перад ўсім таму, што прыморскім гарадам пагражаюць небяспекі не толькі шматлікія, але і схаваныя. Бо цвердая зямля загадзя апавяшчае аб набліжэнні ворагаў … паміж тым, вораг, які прыходзіць з мора на караблях, можа з'явіцца раней…» [1, с. 81]. Акрамя таго, філосаф крытыкуе прыморскія гарады за падзенне ў іх нораваў, што ў рэшце рэшт паслябляе магутнасць дзяржавы: «Жыхары … не адчуваюць прывязанасці да насіжанага месца … утойвае ў сябе шмат разаральных і схіляючых да гультайства спакусаў» і прыводзіць прыклад з грэчаскай гісторыі, пазначаючы, што ўсе прычыны бядотаў Грэцыі былі звязаны менавіта з прыморскім размяшчэннем гарадоў [1, с. 81]. У выніку ён выказаў упэўненасць, што ў выпадку з Рымам сітуацыя будзе зусім іншая: «Ромул … прадбачыў, што наш горад рана альбо позна стане асяродкам найвялікшай дзяржавы. Бо гораду, размешчанаму ў якой бы то ні было іншай частцы Італіі, ледзьве б атрымалася з большай лёгкасцю захаваць сваю магутнасць» [1, с. 82]. Гэтыя развагі Цыцэрона яскрава сведчаць аб тым, што ён выдатна разумеў, фармуляваў геапалітычныя прынцыпы і раіў іх выкарыстоўваць.

Адным з найбольш выбітных рымскіх тэарэтыкаў тагачаснай геапалітычнай думкі з'яўляецца географ і гісторык **Страбон** (64/63 г. да н. э. – 23/24 г. н. э). Ён нарадзіўся ў г. Амасіі (Пантыйскае царства) у грэчаскай сям'і, якая служыла пантыйскім царам. Як і некаторыя іншыя мысліцелі, шмат падарожнічаў, жыў у Рыме, быў знаёмы з палітычнымі дзеячамі і навукоўцамі. Ягоная першая праца «Гістарычныя нататкі» да нашага часу не захавалася. Сусветна вядомы іншы твор – «Геаграфія», які складаецца з 17 кніг. Змест іх носіць несумнеўны геапалітычны характар. Гэты твор нават называюць даведнікам па кіраванні імперыяй для рымскіх чыноўнікаў. Так, Страбон пазначаў, што «карысць ад геаграфіі вельмі значная, у тым ліку яна дастасоўная для дзейнасці дзяржаўных людзей або ўладароў» [2, с. 7].

Аргументуе гэта ён наступным чынам: «вялікая частка геаграфіі служыць патрэбам дзяржавы, бо арэна дзейнасці дзяржаў – зямля і мора ... Найбольшая арэна ахоплівае ўсю зямлю ... і яна таму павінна быць арэнай найбольш важнай дзейнасці ... найвялікшыя ўладары – гэта выключна людзі, якія могуць панаваць на сушы і на моры і аб'ядноўваць народы і гарады пад адзінай уладай і адзіным палітычным кіраваннем. Таму відавочна, што геаграфія, як цэлае, мае прамое стаўленне да дзейнасці уладароў ... бо гаспадары могуць лепш кіраваць кожнай асобнай краінай, ведаючы якая яна вялікая, як размешчана, у чым адметныя асаблівасці яе клімату і глебы» [2, с. 15]. Геаграфія Страбона і зараз выклікая шмат увагі ў даследчыкаў геапалітыкі.

**Луцый Анэй Сенэка** (каля 55 г. да н. э. – 40 г. н. э.), рымскі філосаф, паэт і дзяржаўны дзеяч, выхавацель будучага імператара Нерона. Гэты мысліцель быў знакаміты сваімі маральнымі трактатамі. Як і ў кожнага філосафа, ягоныя думкі тычыліся самых разнастайных тэматык. Так, у трактаце «Аб прыродзе» ў кнізе 1 «Аб агнях і паветры» ён выказываўся аб зусім невялікім, на яго погляд, населеным свеце, былой элінскай Айкумене: «Раскошныя каланады, якія зіхацяць слановаю косткаю, наборныя столі, памастацку пастрыжаныя алеі, рэкі, якія бруяцца ў хатах, не выклічуць пагарды ў душы да таго часу, пакуль яна не абыдзе ўвесь свет, і аглядаючы з гары шчыльнае кола земляў, і без гэтага закрытае па большай частцы морам, але і ў астатняй сваёй частцы амаль паўсюль пустынна-дзікае, скаванае альбо спёкаю, альбо сцюжаю, не кажа сама сабе: "І гэта – тая самая кропачка, якую столькі плямёнаў дзеляць паміж сабою агнем і мячом?" І працягвае далей: «О як смешныя ўсе гэтыя межы, якія ўсталёўваюцца смяротнымі! Вось, наша зброя не павінна пускаць дакаў праз Істр, а фракійцаў праз Гем; Парфянам павінен перашкаджаць шлях Яфрат; Данубій – абмяжоўваць рымлян ад сарматаў; Рэйн – пакласці мяжу Германіі; Перанейскі хрэбет – узвышацца пасярэдзіне паміжм Галіямі і Іспаніямі; мертвыя безжыццёвыя пясчаныя пустэчы – падзяляць Егіпет і Эфіёпію» і падсумоўвае свае думкі: «Цікава, калі б хто б даў мурашам чалавечы розум, няўжо і яны падзялілі б сваю палянку на мностна правінцый?» [3, с. 182–183]. Але маралізатарства Сенэкі не спыніла рымскі эспансіянізм, а толькі адцяняла яго.

**Луцый Местрый Плутарх** (каля 46 г. – каля 127 г.) пісьменнік, гісторык і філосаф грэчаскага паходжання. Пэўны час жыў у Рыме, дзе

чытаў публічныя лекцыі. Меў раманафільскія погляды, што набыло яму добрае стаўленне імператараў Траяна і Адрыяна. Вучоны шмат падарожнічаў па Грэцыі, Італіі, Малой Азіі і Егіпце. Як пісьменнік ён вызначаўся рознабаковымі інтарэсамі. Для нас найвялікшую цікавасць выклікаюць ягоныя «Выбраныя жыццёпісанні», дзе на прыкладзе параўнальных дуэтных жыццёпісаў знакамітых грэкаў і рымлян магчыма зразумець геапалітычныя погляды Плутарха і ягонага часу. Менавіта яму належыць думка, што «вялізная імперыя заўсёды вядзе вайну з якой-небудзь суседняй з ягонымі ўладаннямі замежнай дзяржаваю» і ў выніку сярод герояў яго твора было шмат палкаводцаў [4, с. 147].

Адным з найцікавейшых і паказальных у творы Плутарха з'яўляецца жыццёпіс рымскага палітычнага і вайсковага дзеяча Гнея Пампея Вялікага (106 г. – 48 г. да н. э.). Так, кажучы аб стратэгічных планах Пампея, гісторык піша: «цяпер ім авалодала бурнае памкненне захапіць Сірыю і прайсці праз Аравію да Чырвонага мора, каб пераможна дасягнуць Акеана, які атачыў з усіх бакоў заселены свет. Бо і ў Афрыцы ён першы дайшоў з перамогаю да Знешняга мора, і ў Іберыі зрабіў Атлантычны акіян межаю Рымскай дзяржавы … Пампей вырашыў зноў выступіць з войскам, каб замкнуць Чырвоным морам кола сваіх паходаў» [5, с. 314]. У другім выпадку, апісваючы заваёвы знакамітага Гая Юлія Цезара, які далучыў да Рыма тэрыторыю ад Атлантычнага акіяна да Рэйна, пісьменнік адзначае: «Ён быў першым, хто выйшаў на Заходні акіян і пераправіўся з войскам праз Антлантычнае мора, пашырыў рымскае панаванне за межы вядомага кола земляў» [5, с. 456]. Падтрымка рымскага эспансіянізму была заўважальнаю рысаю поглядаў Плутарха.

Рымскі палітык, гісторык і пісьменнык **Публій Карнэлій Тацыт** (каля 55 г. – каля 120 г.), нарадзіўся ў Галіі, пазней вучыўся ў Рыме. Ён быў вядомы сваімі гістарычнымі працамі. Ягоныя геапалітычныя погляды можна пабачыць на старонках розных твораў, напрыклад у «Гісторыі», дзе Тацыт выдатна вылучае ролю геаграфічных умоў, пераваг сушы альбо мора падчас шматлікіх рымскіх ваенных паходаў. Але найлепей гэта бачна на перакладзе адносна невялікага, аднак вельмі цікавага твора «Германія», напісанага ў 98 г. У ім гісторык дае падрабязную характарыстыку межаў і геаграфіі земляў германцаў, называючы яе «няўтульнай і бязрадаснай». Таксама, як і калісці старажытнагрэчаскія філосафы, Тацыт звязвае характар жыхароў гэтых зямель з суровым германскім кліматам: «непагадзь і глеба прывучылі іх лёгка вытрымліваць холад і голад» [6, с. 460].

Зазначым, што цікавасць гісторыка да германскіх плямёнаў была невыпадковаю. Насамрэч ён, паказваючы няўтульнасць германскай прыроды, беднасць і варварства германцаў, іх культуры, міжплямённую варожасць, распавядаў аб жыцці імперыі. Усё гэта яму было важна для абгрунтавання на гэтых землях пануючага становішча цывілізаванага Рыма. Як піша знаўца ягонай творчасці Г. С. Кнабэ: «У кнізе Тацыта Германія і Рым выступаюць як ворагі … Перад намі векавое супрацьстаянне двух узаемавыключаючых ладаў жыцця, дзе сутыкнуліся Imperium, г. зн. дзяржаўны арганізм, падпарадкаваны цэнтральнай уладзе, якая абапіраецца на вайсковую моц, і Germanorum libertas “германская вольнасць”, – хаос мясцовых інтарэсаў і эгаістычнага свавольства» [7, с. 137].

**Аміян Марцэлін** (каля 330 г. – пасля 395 г.). Спецыялісты лічаць яго апошнім гісторыкам антычнасці. Па сваімі паходжанні ён быў са знатнай сям'і сірыйскіх грэкаў. Служыў целаахоўнікам у свіце рымскіх імператараў, ўдзельнічаў у шматлікіх ваенных паходах. Пасля таго як пакінуў вайсковую службу, жыў у Рыме і шмат падарожнічаў. Аўтар свайго адзінага твора «Дзеі», вядомага яшчэ пад назвамі «Гісторыя» альбо «Рымская гісторыя».

Як былы прадстаўнік вайсковага атачэння імператараў добра разумеў іх стратэгію развіцця імперыі, нават выконваў выведвальныя місіі. Гэта тлумачыць нам той факт, што ў кнізе маецца не адна аўтарская геапалітычная развага. Так, шмат увагі нададзена апісанню прыроды і гарадоў малаазійскіх правінцый імперыі, Персіі альбо Галіі і іншых. Напрыклад, кажучы аб ваенных дзеяннях 357 г. рымскага суправіцеля ўсходняй часткі імперыі Флавія Юлія Валента ў Фракіі, ён піша: «ва Фракіі распаліліся новыя войны. Валент, кіруючыся планам, ухваленым ягоным братам … узняў зброю на готаў … тут будзе дарэчы ў кароткім адступленні распавесці аб лёсе і геаграфічным становішчы тых краін» [8, с. 79]. Далей ён апісвае месцы, дзе жылі «дзікія народы», з якімі адбываліся «жорсткія бітвы», але «з узрастаннем моцы рымскай дзяржавы … Фракія перайшла пад ўладу нашых продкаў, і гэткім чынам пасля небяспечных паходаў набыты былі шэсць правінцый» [8, с. 79]. Несумнеўна, «апошні рымскі гісторык», як і ранейшыя, падтрымліваў рымскі эспансіянізм.

**Заключэнне.** Гэткім чынам, відавочна, што ўзгаданыя рымскія гісторыкі, географы, пісьменнікі мелі вялікую цікавасць да геапалітыкі. Яны выказвалі розныя думкі на гэты конт, а старонкі іх твораў дэманструюць нам не толькі іх уласны погляд, але і ўвогуле прыклады геапалітычнай тэорыі і практыкі рымскіх часоў. Маючы цесную сувязь са старажытнагрэчаскімі поглядамі, рымская геапалітычная канцэпцыя праз беспыннае вядзенне захопніцкіх войнаў і пашырэнне

межаў імперыі ў выніку атрымала экспансіяніцскі характар.

Але геапалітычныя думкі і погляды рымскіх мысліцеляў не згаслі з падзеннем імперыі, яны выклікалі цікавасць і ў наступныя стагоддзі, а пазней ляглі ў аснову тэорый класікаў геапалітычнай думкі XIX–XX стст. і сучаснасці.

## Спіс літаратуры

1. Цицерон М. Т. О государстве; О законах; О старости; О дружбе; Об обязанностях; Речи, письма. М.: Мысль, 1999. 782 с.

2. Страбон. География. М.: НИЦ «Ладомир», 1994. 943 с.

3. Сенека Луций Анней. Философские трактаты. СПб.: Алетейя, 2000. 400 с.

4. Плутарх. Избранные жизнеописания: в 2 т. М.: Правда, 1986. Т. I. 592 с.

5. Плутарх. Избранные жизнеописания: в 2 т. М.: Правда, 1987. Т. II. 608 с.

6. Тацит П. К. Анналы; Малые произведения; История. М.: АСТ НИЦ «Ладомир», 2001. 985 с.

7. Кнабе Г. С. Корнелий Тацит. М.: Наука, 1981. 208 с.

8. Аммиан Марцеллин. Римская история. СПб.: Алетейя, 2000. 576 с.

## References

1. Tsitseron M. T. *O gosudarstve; O zakonakh; O starosti; O druzhbe; Ob obyazannostyakh; Rechi, pis'ma* [About the state; About laws; About old age; About friendship; About responsibilities; Speeches, letters]. Moscow, Mysl' Publ., 1999. 782 p. (In Russian).

2. Strabon. *Geografiya* [Geography]. Moscow, NITs "Ladomir" Publ., 1994. 943 p. (In Russian).

3. Seneka Lutsiy Anney. *Filosofskie traktaty* [Philosophical treatises]. St. Petersburg, Aleteyya Publ., 2000. 400 p. (In Russian).

4. Plutarkh. *Izbrannye zhizneopisaniya: v 2 t.* [Selected biographies: in 2 vol.]. Moscow, Pravda Publ., 1986, vol. I. 592 p. (In Russian).

5. Plutarkh. *Izbrannye zhizneopisaniya: v 2 t.* [Selected biographies: in 2 vol.]. Moscow, Pravda Publ., 1987, vol. II. 608 p. (In Russian).

6. Tatsit P. K. *Annaly; Malye proizvedeniya; Istoriya* [Annals; Small works; History]. Moscow, AST NITs "Ladomir" Publ., 2021. 985 p. (In Russian).

7. Knabe G. S. *Korneliy Tatsit* [Cornelius Tacitus]. Moscow, Nauka Publ., 1981. 208 p. (In Russian).

8. Ammian Martsellin. *Rimskaya istoriya* [Roman history]. St. Petersburg, Aleteyya Publ., 2000. 576 p. (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Астрога Віктар Аляксандравіч** – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры мытнай справы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 4, Рэспубліка Беларусь). E-mail: ostroga.v@mail.ru

## Information about the author

**Astroha Victor Alexandrovich** – DSc (History), Professor, Head of the Department of Customs Affairs. Belarusian State University (4, Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroga.v@mail.ru

*Паступіла 10.03.2022*